Т. В. Сысуева, Е. А. Унукович был издан первый в Республике Беларусь учебник «Гражданский процесс» (Общая и Особенная части), (2000, 2002), а также практикум. Преподаватели кафедры приняли активное участие в подготовке нового ХПК Беларуси и комментария к нему, практикума по хозяйственному процессу.

Таким образом, несмотря на имеющиеся публикации и важность исследуемой проблемы, гражданское процессуальное право Белорусской ССР комплексному изучению не подвергалось ни в советский, ни в современный периоды. В связи с этим необходимо дальнейшее изучение развития гражданского процесса в советский период развития белорусской государственности с учетом наилучших достижений ученых советского периода.

**Гушчынскі Ігар Генадзьевіч**

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка (Минск, Беларусь)*

## РЭАЛІЗАЦЫЯ ПАЛІТЫКІ ЧАСОВАГА ЎРАДА Ў СФЕРЫ СУДА НА ТЭРЫТОРЫІ МІНСКАЙ, ВІЦЕБСКАЙ І МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНЯЎ (САКАВІК– КАСТРЫЧНІК 1917 Г.)

Часовы ўрад у якасці асновы сваёй палітыкі ў сферы суда абвясціў не пабудову новай судовай сістэмы замест старой, а вяртанне да прынцыпаў, абвешчаных у Судовых статутах ад 20 лістапада 1864 г. — незалежнасці судовай улады, галоснасці, выбарнасці суддзяў і інш. Судовая рэформа 1864 г. у свой час апярэдзіла агульны ход працэсу палітычнай мадэрнізацыі Расійскай імперыі, у сувязі з чым у наступным стала аб'ектам карэкціровак кансерватыўна-ахоўчага характару. Часовы ўрад прыняў шэраг канкрэтных мер па скасаванні заканадаўчых навэл, прынятых самадзяржаўем ў 70—80-х гг. XIX ст. для абмежавання абвешчаных Судовымі статутамі прынцыпаў (незалежнасці, галоснасці, спаборнасці суда і інш.). Былі ліквідаваны «асобые» суды, якія выконвалі функцыю рэпрэсіі па злачынствах палітычнага характару (Вярхоўны крымінальны суд, асобыя прысутнасці Сената, судовых палат і акруговых судоў з удзелам саслоўных прадстаўнікоў) [16, с. 21]. Канчаткова скасаваўся інстытут земскіх участковых начальнікаў [16, с. 13], які па сваёй сутнасці супярэчыў прынцыпам незалежнасці і усесаслоўнасці суда. Вярталіся выбарныя міравыя суды [17, с. 224—238]. Жанчыны атрымалі права займацца адвакацкай дзейнасцю [17, с. 554]. Некаторыя дзеянні Часовага ўрада па дэмакратызацыі правасуддзя выходзілі за рамкі проста вяртання да першапачатковага тэксту Судовых статутаў. Напрыклад, паводле пастановы ад 30 мая 1917 г. ствараўся інстытут адміністрацыйнай юстыцыі — сістэма спецыяльных судовых устаноў для разгляду скарг адміністрацыйна-прававога характару на дзеянні органаў дзяржаўнага кіравання [17, с. 527—540]. Гэта мела важнае значэнне для фарміравання грамадзянскай супольнасці ў краіне.

Адным з першых захадаў Часовага ўрада па рэфармаванні судовай сістэмы стала прыпыненне дзейнасці земскіх начальнікаў [16, с. 13]. Адпаведнае прадпісанне старшыні Часовага ўрада Г. Львова губернскія камісары атрымалі 21 сакавіка 1917 г. Судовыя функцыі земскіх начальнікаў ускладаліся

на часовых суддзяў, якія прызначаліся губернскімі камісарамі па ўзгадненні з павятовымі камісарамі [4, арк. 4]. У наступным часовыя суддзі павінны былі перадаць свае паўнамоцтвы выбарным міравым судам.

У розных губернях ідэя замены земскіх участковых начальнікаў часовымі суддзямі была рэалізавана з рознай ступенню паспяховасці. У Мінскай губерні, прычым ва ўсіх яе паветах, часовыя суддзі былі прызначаны і прыступілі да выканання сваіх абавязкаў у красавіку 1917 г. [4, арк. 23—26]. Яны тут дзейнічалі, пакуль дадзеныя пасады не былі скасаваны бальшавікамі ў канцы 1917 г. Справа ў тым, што да гэтага часу выбары міравых суддзяў, за выключэннем Барысаўскага павета, тут так і не былі праведзеныя. Асноўнай дылемай, перад якой аказаўся губернскі і павятовыя камісары пры фарміраванні асабовага складу часовых суддзяў, стала пытанне аб прыцягненні на дадзеныя пасады былых земскіх участковых начальнікаў. У масавай свядомасці яны ўвасаблялі парадкі толькі што звергнутага і крайне непапулярнага рэжыму. Таму іх прызначэнне нярэдка выклікала пратэсты з боку грамадскасці. З рознай ступенню рашучасці супраць прыцягнення на пасады часовых суддзяў былых земскіх начальнікаў выступілі Сялянскі з'езд, які адбыўся ў красавіку 1917 г. у Мінску [6, арк. 15], Мінскі камітэт пры павятовым камісары [4, арк 9—9 адв.], Слуцкі і Бабруйскі павятовыя камітэты [9, арк. 25], [6, арк. 15—15 адв.], Калінкавіцкі выканаўчы камітэт [8, арк. 3], камітэт грамадскіх арганізацый пры Клецкім участковым камісары [9, арк. 52—53], Рэчыцкі з'езд валасных камітэтаў [8, арк. 18—18 адв.], Заслаўскі, Ракаўскі і Івянецкі валасныя камітэты Мінскага павета [7, арк. 36—37], [7, арк. 53]. У той жа час былыя земскія начальнікі мелі досвед судзейскай дзейнасці, у некаторых выпадках юрыдычную адукацыю. Часта дзякуючы сваёй працы яны карысталіся сапраўдным аўтарытэтам і павагай ў асяродку насельніцтва. Акрамя таго, меў месца дэфіцыт ахвотных і пры гэтым здольных выконваць судзейскія абавязкі, у выніку чаго былыя земскія начальнікі у некаторых паветах заставаліся практычна адзінымі кандыдатурамі. У Мінскай губерні каля паловы прызначаных у красавіку 1917 г. часовых суддзяў (30 з 61) з'яўляліся былымі земскімі ўчастковымі начальнікамі. Астатнія — з ліку кандыдатаў на судовыя пасады, адвакатаў, памешчыкаў і інш. [5 арк. 32—34 адв.].

У Віцебскай губерні спроба замяніць скасаваных земскіх начальнікаў часовымі суддзямі фактычна не ўдалася. Вясной-летам 1917 г. яны функцыянавалі толькі ў Невельскім (да 1 чэрвеня), Полацкім (да 1 жніўня), Себежскім (прынамсі яшчэ ў жніўні) і, магчыма, Віцебскім паветах. А ў чэрвені — пачатку жніўня 1917 г. ва ўсіх паветах губерні, акрамя Себежскага, былі выбраныя і пачалі працу міравыя суддзі [11, арк. 38—46]. Што датычыць Магілёўскай губерні, то, на жаль, звестак аб прызначэнні і дзейнасці тут часовых суддзяў выявіць не ўдалося.

Значная ўвага Часовым урадам была ўдзелена інстытуту міравой юстыцыі. 4 мая 1917 г. была выдадзена пастанова аб часовым уладкаванні мясцовага суда [16, с. 224—238]. Яна прадугледжвала ўвядзенне выбарных міравых судоў ў 33-х губернях, дзе іх да гэтага яшчэ не было, у тым ліку Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай. Міравых суддзяў павінны былі выбіраць земскія павятовыя сходы і гарадскія думы. Прычым міравыя суды станавіліся не аднаасобнымі, а калегіяльнымі судовымі органамі. Разам з міравым суддзёй у вырашэнні спраў павінны былі браць удзел два так званыя члены міравога суда. У гара-

дах іх павінны былі вылучаць гарадскія думы, у сельскай мясцовасці — земскія валасныя сходы.

Працэс укаранення інстытута міравых суддзяў у розных губернях адбываўся па рознаму. У Мінскай губерні ў 1917 г. міравыя суддзі былі выбраныя і дзейнічалі толькі ў Барысаўскім павеце [3, арк. 4]. У Віцебскай губерні неабходнасць хутчэйшага ўкаранення міравой юстыцыі адчувалася асабліва востра, бо на большай яе частцы земскія начальнікі пасля іх скасавання не былі замененыя часовымі суддзямі. Тут стварылася сітуацыя, калі на працягу 3—4-х месяцаў фактычна не было мясцовых судовых органаў, прынамсі ў сельскай мясцовасці. Тым часам масавы характар набылі такія злачынствы, як захопы сялянамі памешчыцкай зямлі, самавольныя парубкі лесу, пакосы сена і інш. [10, арк. 12, 13, 17, 19, 20, 58 і інш.]. Падтрыманне парадку ў адсутнасці судоў ніжэйшага звяна было практычна немагчымым. Таму мясцовыя ўлады прыкладалі намаганні па хутчэйшаму ўкараненню міравой юстыцыі. Ва ўсіх паветах Віцебскай губерні, акрамя Себежскага, летам 1917 г. міравыя суддзі былі выбраныя і прыступілі да працы [11, арк. 38—46]. У Магілёўскай губерні міравыя суды пачалі дзейнічаць восенню 1917 г. [1].

Паводле ўжо згаданай пастановы Часовага ўрада ад 4 мая 1917 г. аб уладкаванні мясцовага суда спынялі сваё існаванне валасныя суды, якія ўваходзілі ў структуру сістэмы сялянскага самакіравання. Адпаведна, прадугледжвалася павелічэнне колькасці міравых суддзяў у паветах у параўнанні з лічбай земскіх начальнікаў. Але да моманту пачатку непасрэднай працы выбраных міравых судоў валасныя суды павінны былі працягваць дзейнічаць. Аднак у шматлікіх выпадках яны ліквідаваліся яшчэ ў сакавіку–красавіку 1917 г. разам са скасаваннем валасных праўленняў [12, арк. 5]. Па словах Віцебскага губернскага камісара А. Валковіча, адносіны насельніцтва да валасных судоў былі рэзка негатыўнымі [12, арк. 5].

Важнае значэнне ў кантэксце руху краіны пасля звяржэння самадзяржаўя ў кірунку фарміравання грамадзянскай супольнасці мела ўвядзенне паводле пастановы ад 30 мая 1917 г. інстытута адміністрацыйнай юстыцыі. Стваралася спецыяльная сістэма судовых устаноў для рэгулявання ўзаемаадносін грамадства і мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання. [17, с. 527—540]. Яна складалася з аднаасобных адміністрацыйных суддзяў, якія дзейнічалі ў паветах, адміністрацыйных аддзяленняў акруговых судоў, 1-га дэпартамента Сената. Гэтыя судовыя ўстановы разглядалі скаргі на дзеянні мясцовых улад (камісараў, земстваў, гарадскіх дум і г. д.) і іх службовых асоб. Юрысдыкцыя органаў адміністрацыйнай юстыцыі размяркоўвалася наступным чынам. Адміністрацыйныя суддзі разглядалі скаргі на дзеянні устаноў і службовых асоб валаснога кіравання. Усе астатнія справы, акрамя скарг на губернскага камісара, былі падсудны адміністрацыйным аддзяленням акруговых судоў. Пратэсты на дзеянні губернскіх камісараў разглядаліся 1-м дэпартаментам Сената. Адміністрацыйныя суддзі ў паветах Мінскай і Віцебскай губерняў былі прызначаны прыказамі Міністра юстыцыі ў ліпені–верасні 1917 г. [13], [14], [15, с. 95—96, 103]. На жаль, практычна не захавалася дакладных звестак аб іх дзейнасці, а ў большасці выпадкаў — нават аб тым, ці ўвогуле яны прыступілі да працы. Вядома, што восенню 1917 г. яны дакладна функцыянавалі ў Мінскім [2, арк. 34] і Віцебскім паветах [2, арк. 69]. Да ўвядзення адміністрацыйных суддзяў адпаведныя абавязкі ўскладаліся на мясцовых

міравых суддзяў [17, с. 541]. А там, дзе яны яшчэ не былі выбраныя, дадзеныя функцыі перадаваліся часовым суддзям [5, арк. 90]. Звестак аб дзейнасці адміністрацыйных аддзяленняў акруговых судоў на тэрыторыі Беларусі таксама няшмат. Вядома, што ў Мінску яно было адкрыта 1 ліпеня 1917 г. і функцыянавала да 17 снежня 1917 г. [2, арк. 11—11 адв.]. У канцы ліпеня — пачатку жніўня 1917 г. прыказамі міністра юстыцыі быў сфарміраваны склад суддзяў адміністрацыйных аддзяленняў Віцебскага і Магілёўскага акруговых судоў [15, с. 95—96, 109].

Такім чынам, дзейнасць Часовага ўрада ў сферы суда ў сакавіку—кастрычніку 1917 г. была накіравана на дэмакратызацыю правасуддзя. Гэта выявілася ў ліквідацыі элементаў саслоўнасці, пашырэнні практыкі выбарнасці суддзяў і замацаванні прынцыпу іх нязменнасці. Гэта значна памяншала ступень залежнасці суда ад адміністрацыйнай улады, а значыць адпавядала задачам пабудовы дэмакратычнай прававой дзяржавы. Ажыццяўленне на практыцы згаданых мерапрыемстваў Часовага ўрада праходзіла ў вельмі цяжкіх умовах: агульная палітычная нестабільнасць і вострыя сацыяльныя супярэчнасці ў грамадстве, недахоп фінансавання, праблема кадравага забеспячэння абноўленых судовых устаноў. На тэрыторыі Беларусі гэтыя з'явы ўзмацняліся прыфрантавой абстаноўкай. У такой сітуацыі судовая сістэма не заўсёды спраўлялася з задачамі абароны правоў грамадзян і кантролю выканання законнасці ў дзяржаве ўвогуле. Такія важныя пераўтварэнні, як укараненне інстытутаў адміністрацыйнай юстыцыі і выбарнага міравога суда, да кастрычніка 1917 г. так і не былі да канца рэалізаваны.

### Бібліяграфічны спіс


1. Могилёвские губернские ведомости. — 1917. — №№ 37—49.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). — Ф. 183. Воп. 1. Спр. 522.
3. НГАБ. — Ф. 183. Воп. 1. Спр. 554.
4. НГАБ. — Ф. 1684. Воп. 1. Спр. 8.
5. НГАБ. — Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 1.
6. НГАБ. — Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 2.
7. НГАБ. — Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 5.
8. НГАБ. — Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 10.
9. НГАБ. — Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 11.
10. НГАБ. — Ф. 3445. Воп. 1. Спр. 33.
11. НГАБ. — Ф. 3445. Воп. 1. Спр. 37.
12. НГАБ. — Ф. 3445. Воп. 1. Спр. 63.
13. Приказы по ведомству Министерства юстиции // Вестник Временного правительства. — 1917. — 11 авг. — С. 4.
14. Приказы по ведомству Министерства юстиции // Вестник Временного правительства. — 1917. — 16 (29 сент.). — С. 4.
15. Приказы по ведомству Министерства юстиции // Журнал Министерства юстиции. — 1917. — № 7—8. — С. 81—123.
16. Сборник указов и постановлений Временного правительства. Выпуск № 1. 27 февраля — 5 мая 1917 г. — Петроград: Гос. канцелярия, 1917. — VI, 2, 555 с.
17. Сборник указов и постановлений Временного правительства. Выпуск № 2. 5 мая — 24 июля 1917 г.: в 2 ч. — Петроград: Гос. канцелярия, 1918. — Ч. 1. — Отд. I—VIII—XII, 799 с.